УДК 947.6

А. А. Дамарад, асістэнт

# ЭВАЛЮЦЫЯ ПАЛІТЫКІ САМАДЗЯРЖАЎЯ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ВЫШЭЙШАГА САСЛОЎЯ БЕЛАРУСІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

The article deals with the situation in the sphere of the Russian empire authorities policy in Belarus which was referred at higher groups of society. On the basis of archival sources and scientific researchs this diverse politics of central and local government are researched. This process was slow evolution to strict and drastic measures for local nobility. The main reasons of this was urge towards limitations of poor nobility amount in western gybernies and also wish for destruction of old traditions.

**Уводзіны.** Статус спадчыннага двараніна Расійскай імперыі стаў для шляхты былой Рэчы Паспалітай адзіным шляхам вырataваць і захаваць сваё адметнае становішча ў сацыяльнай структуры грамадства пасля далучэння Беларусі і правабярэжнай Украіны да Расіі. Гэтае імкненне было натуральным у агульным кантэксце мерапрыемстваў царскага ўрада па ўладкаванні заходніх губерняў. Адразу заўважым, што мерапрыемствы, якія планавалі правесці на гэтых тэрыторыях, далёка не заўсёды былі рэалізаваны на практыцы, а таксама відавочны пэўныя ваганні ўрада па шляхецкім пытанні.

Пры даследаванні гэтай праблемы нельга не звярнуць увагу на працы такіх гісторыкаў як Д. Бавуа [1], В. Шандра [2], С. Лісенка [3].

**Асноўная частка.** Нягледзячы на выданне ў 1785 г. «Жалаваннай граматы дваранству», масавая легітымацыя дваранскіх правоў шляхты заходніх губерняў не праводзілася каля 10 гадоў. Справа ў тым, што толькі ў 1797 г. быў падпісаны апошні трактат паміж Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй, паводле якога Расійская імперыя замацавала за сабою Літву, Заходнюю Беларусь, Валынь, Падолле, Кіеўшчыну. Палажэнні гэтай канвенцыі мелі вялікі ўплыў на палітыку ўладаў Расійскай імперыі на адзначаных тэрыторыях. Акрамя таго, гэтая канвенцыя ліквідавала польскае падданства, што адкрывала «перспектыву прыцягнення расійскім урадам на службу велізарнай колькасці насельніцтва» [3, с. 12].

Гэтая праблема (інкарпарацыя шляхты ў сацыяльную структуру Расійскай імперыі) вырашалася на працягу больш чым паўстагоддзя. Менавіта па гэтай прычыне праводзілася рэвізія 1795 г. і прымаўся цэлы шэраг законаў канца XVIII ст. Нягледзячы на тое, што імператар Павел I і скасаваў дзеянне дваранскай граматы, ён таксама спрабаваў адшукаць «ідэальнае рашэнне» для шляхты. У прыватнасці, у 1797 г. Павел I пісаў аб гэтай групе насельніцтва: «Я всего пристойней нахожу, определять их в армейские полки унтер-офицерами, а тем, которые из них и поведением, и видом отличаются, присылать в Петербург для помещения в конную Гвардию, в Лейб-Гусарские эскадроны и даже в Кавалергардский корпус; сим образом доставится им не только способ к содержанию в жизни, но и к выгодному продолжению оной» [4 с. 524]. У гэтым кантэксце перад урадам паўстаў шэраг праблем:

– шляхта складала значную частку насельніцтва на тэрыторыях былой Рэчы Паспалітай, а захаванне яе прывілеяў вяло да памяншэння падатковых паступленняў з гэтых правінцый;

– шляхта, у выпадку прызнання за ёй правоў расійскага дваранства, стварала велізарны дысбаланс размяшчэння гэтага прывілеяванага стану па тэрыторыях;

– існаванне шляхты магло мець разбуральны ўплыў на сацыяльную структуру Расійскай імперыі, у якой статус кожнага вызначаўся наяўнасцю ці адсутнасцю маёнткаў з прыгоннымі;

– культурная, рэлігійная і маёмасная адметнасць шляхты ўспрымаліся як патэнцыйная пагроза, якая асацыіравалася з жаданнем аднавіць польскую дзяржаўнасць.

Аднак актывізацыя ўрадавых дзеянняў у вырашэнні шляхецкага пытання прыпадае на 1800 г., калі быў выдадзены шэраг указаў, якія вызначалі напрамкі гэтага працэсу. Прычынай такой актывізацыі стала данясенне імператару стацкага саветніка Катлубіцкага аб велізарнейшых стратах казны па заходніх губернях. Згодна з гэтым дакументам, шляхта магла стаць адной з фіскальных крыніц, даючы казне да двух мільёнаў рублёў [3, с. 24]. Але ўступленне на прастол Аляксандра I змяніла сітуацыю ў заканадаўстве аб дваранстве. Адзіным заканадаўчым актам ў гэтай сферы, які працягваў дзейнічаць, быў указ аб стварэнні і публікацыі Агульнага гербоўніка. Аднаўленне «Жалаванай граматы дваранству» адзначылася масавым прызнаннем шляхты ў спадчынным дваранстве на працягу 1801–1804 гг., аб чым сведчаць як нашыя назіранні паводле матэрыялаў Віленскага генерал-губернатарства, так і сцвярджэнні іншых даследчыкаў па матэрыялах Кіеўскага генерал-губернатарства. У гэтым працэсе праявіліся і агульныя для заходніх губерняў асаблівасці. Найперш неабходна ўзгадаць, што тагачаснае заканадаўства прызнавала 15 бясспрэчных доказаў спадчыннага дваранства. Не называючы іх ад значым, што працэс легітымацыі шляхты выявіўся не такім дасканалым, як яго хацелі бачыць у Санкт-Пецярбурзе. Масавым сюжэтам стала прызнанне дваранскіх правоў на падставе толькі другарадных дакументаў (сведчанні іншых асоб,

арэндадаўцаў, метрычных запісаў і г. д.). Але нават такія прызнанні ў дваранстве губернскімі дэпутацкімі сходамі не маглі хутка вырашыць шляхецкае пытанне. Мясцовым чыноўнікам было зразумела, што ў вызначаны тэрмін немагчыма правесці праверку правоў кожнага, хто прэтэндаваў на статус спадчыннага двараніна Расійскай імперыі. З гэтай нагоды ў верасні 1803 г. маршалак Літоўска-Віленскай губерні Міхал-Геранім Бржастоўскі падаў міністру ўнутраных спраў графу В. Качубею рапарт пра неабходнасць «облегчить способы в отыскании дворянства убогой шляхте» [5, с. 6]. Падобныя дакументы з'явіліся і ва ўкраінскіх губернях (на імя ваеннага губернатара Аляксандра Тормасава). У выніку тэрмін пацверджання дваранскіх правоў падаўжаўся не адзін раз на працягу ўсёй першай трэці XIX ст. Неабходна заўважыць, што ў 1800-х гг. дробная шляхта ў свядомасці імперскіх чыноўнікаў належала да самабытных этнічна-сацыяльных груп, як, напрыклад, яўрэі [3, с. 32]. Існаванне такой катэгорыі насельніцтва афіцыйныя законатворцы нават спрабавалі растлумачыць праз мадэліраванне такой з'явы, якая пазней будзе акрэслена як «безмерное размножение сомнительных русских дворян, в которых спешили превращать шляхту» [3, с. 33]. Сцвярджалася, што ў выніку такой сітуацыі шмат асоб недваранскага паходжання выдавалі сябе за шляхту. Імі былі мяшчане, вольныя асобы, зафіксаваныя ў такім стане ў рэвізіі 1795 г., дваровыя людзі з сялян, якія ведалі польскую мову, выхадцы з Галіцыі, Варшаўскага княства нерадавітага паходжання, а таксама дэзерціры з расійскай арміі, якія змянілі сваё прозвішча [9]. На карысць гэтага меркавання гаворыць і з'яўленне ў 1808 г. праекта палажэння «Аб шляхце». Праўда, непадпісанне Аляксандрам I гэтага палажэння сведчыла аб паступовым павароце ўрада ад прызнання шляхты асобнай сацыяльнай групай, статус якой мог быць вызначаны спецыяльным законам, да пакідання праблемы нявырашанай на няпэўны тэрмін. Паміж фіксацыяй сацыяльнай самабытнасці шляхты і павольным дрэйфам у бок яе легітымацыі было абрана апошняе. Сярод крыніц адзначанай самабытнасці дробнай шляхты было разуменне «благородного» дваранства як уладальнікаў маёнткаў з прыгоннымі, чым гэтая група шляхты не вызначалася.

Урад нават пайшоў на пашырэнне практыкі напаўлегальных прызнанняў у дваранстве прадстаўнікоў шляхты, хаця збіраў звесткі пра парушэнні. Напрыклад, у 1818 г. стала вядома, што дваранскі дэпутацкі сход прыняў станоўчае рашэнне аб легітымацыі Урбановічаў з Лідскага павета, якія паводле рэвізій 1795 і 1811 гг. былі запісаны ў лік сялян князя Радзівіла, а таксама Кеткоўскіх, якія не мелі ніякіх дакументальных доказаў шляхецтва [6, л. 7].

Акрамя таго, шляхецкая ментальнасць была неаддзельная ад таго сімвалу шляхецкага самакіравання, які ўсё менш выклікаў davеру, але якія баранілі як святую рэліквію часоў «залатой вольнасці». Дзякуючы петыцыям да Паўла I і Аляксандра I шляхце ў Расійскай імперыі ўдалося зберагчы тыя формы (ліквідаваныя ў аўстрыйскай і прускай частках), якія без цяжкасцяў былі прыстасаваныя да структур расійскага дваранства.

Сама ж канцэпцыя расійскага дваранства базіравалася на паняцці службы [1, с. 33 4.] Яна магла быць адміністрацыйнай ці ваеннай. Таму ў мікалаеўскую эпоху праявіліся іншыя асаблівасці атрымання шляхтай статусу дваранаў. Яшчэ на працягу 1827–1829 гг. кіеўскі вайсковы губернатар Пётр Жалтухін звяртаўся да Камітэту Міністраў з прапановай аб правядзенні больш жорсткай палітыкі ў адносінах да шляхты. Ён называў памылкаю шырокую інкарпарацыю шляхты ў расійскае дваранства, паколькі, знаходзячыся непасрэдна ў цэнтры падзей, разумеў, што прызнанне вялікай колькасці шляхты дваранамі будзе перашкаджаць рэалізацыі палітыкі царызму на гэтых тэрыторыях [3, с. 36].

Хрэстаматыйным для шляхецкага пытання стала важнасць закона ад 19 кастрычніка 1831 г. Цікава, што ініцыятарам ягонага выдання стала міністэрства фінансаў [1, с. 54]. Можна дапусціць, аднак, што не гэта паслужыла ўсё ж асноўнай прычынаю з'яўлення дадзенага дакумента. У сваю чаргу рэакцыяй Дваранскіх дэпутацкіх сходаў на яго была вялікая колькасць легітымацый.

Не менш важным стаў указ Сената ад 11 кастрычніка 1832 г. «О разделении на три разряда людей, принадлежащих к сословию бывшей шляхты» [7, с. 836]. Гэтым дакументам шляхта падзялялася на наступныя катэгорыі:

– дваране, як зацверджаныя, так і не зацверджаныя, але якія валодалі населенымі маёнткамі і сялянамі без зямлі або прыгоннымі і дваровымі людзьмі;

– дваране, зацверджаныя Дваранскім дэпутацкім сходам, але якія не валодалі населенымі маёнткамі;

– шляхціцы незацверджаныя, якія не валодалі населенымі маёнткамі.

У гэтым жа ўказе забаранялася выдаваць пасведчанні на дваранства без зацвярджэння Герольдыяй.

Цалкам відавочна, што толькі дваране 1-га разраду мелі ўсе шанцы ў далейшым зберагчы сваё прывілеяванае становішча. Дваране 2-га разраду мелі сумніўныя перспектывы, паколькі гэтая група выглядала вельмі недваранскаю ў вачах улады.

У 1830-я гг. праявілася і пэўнае разбурэнне карпаратыўнасці шляхты. Калі, па сведчанні Д. Бовуа, да 1830 г. «беззямельныя шляхцічы вя-

лі жыццё паводле даўняй шляхецкай салідарнасці, гэтыя маленькія людзі жывуць больш-менш у арбіце і з ласкі багатых, арэндуючы і асабістымі рукамі апрацоўваючы надзел зямлі, жывучы ў хаце, якая не заўсёды ім належыць, і выконваючы разнастайныя дробныя функцыі, якія, аднак, дазваляюць ім захоўваць пачуццё годнасці» [1, с. 157], то ў 1830-х гг. з'яўляюцца выпадкі запісання чыншавай шляхты буйнымі памешчыкамі ў стан сялянаў. Гэтай з'явы, названай польскімі даследчыкамі дэкласацыяй, імкнуліся пазбегнуць усе. Тадэвуш Краўчак пісаў пра гэта наступнае: «Антаганізм шляхецка-сялянскі праяўляўся на кожным кроку. Рознымі спосабамі бараніліся ад ураўнання з сялянамі» [8, с. 251].

Найбольшай жа перашкодай для атрымання статусу спадчыннага двараніна для шляхты стала дзейнасць Цэнтральнай рэвізійнай камісіі на працягу 1840–1844 гг., якая прывяла да вялікай колькасці дэкласацый, асабліва на Правабярэжжы. Менавіта гэты рэгіён Расійскай імперыі стаў месцам расправы над шляхецкай карпарацыяй былой Рэчы Паспалітай. Паводле падлікаў Д. Бавуа, ў 1840–1844 гг. у заходніх украінскіх губернях было дэкласавана (г. зн. выключана са шляхецкага і дваранскага стану) 19 638 сямей. Прычым сярод гэтай колькасці амаль 11 тыс. сямей былі запісаны ў падатныя станы без праверкі дакументаў [1, с. 180]. Такія вынікі дзейнасці рэвізійнай камісіі можна звязаць з дзейнасцю Дз. Г. Бібікава, які на пасадзе кіеўскага генерал-губернатара дамагаўся «зліцця Заходняга рускага краю са старажытнай айчынай прыродных яго жыхароў» [9, с. 27]. Менавіта гэты чыноўнік у справаздачы 12 чэрвеня 1843 г. сцвярджаў, што на 541 прызнаную ў дваранскім статусе асобу прыпадае 79 069 чалавек, якія выключаны са стану шляхты і запісаны ў аднадворцы [1, с. 181].

**Заключэнне.** Такім чынам, менавіта перыяд 1831–1845 гг. стаў пераломным момантам у становішчы шляхты. Новае заключалася найперш у неабходнасці шукаць сваё месца ў сацыяльнай структуры Расійскай імперыі калі не праз губернскі дваранскі сход, то праз іншыя шляхі. А перыяд да 1830 г. быў для шляхты перыядам, калі, нягледзячы на падзелы Рэчы Паспалітай, мала што змянілася ў яе становішчы.

### Літаратура

1. Бовуа, Д. Шляхтич, кріпак і ревізор: Польска шляхта між царизмом та українськими масами (1831–1863) / Д. Бовуа / Переклад з французької Зої Борисюк. – Київ: ІНТЕЛ, 1996. – 415 с.

2. Шандра, В. Київське генерал-губернаторство 1832–1914 рр. Історія створення та діяльності, архівний комплекс і його інформативний потенціал / В. Шандра. – Київ, 1999. – 312 с.

3. Лисенко, С. Правобережна шляхта, кінец XVIII – перша половина XIX ст. / С. Лисенко, Е. Чернецький. – Біла Церква: ТОСК, 2002. – 391 с.

4. О сформировании полка из татар, поселенных в новых провинциях, под названием Пинского, и об определении бедных шляхтичей в армейские полки унтер-офицерами. 1797 Апреля 3. Именный, данный Генералу от Инфантерии Философу // Полное собрание законов Российской империи. – Т. XXIV. – 6.11.1796–1789. – СПб., 1830. – № 17903. – С. 524.

5. Неупокоев, В. И. Преобразование беспоместной шляхты в Литве в податное сословие однодворцев и граждан (вторая треть XIX в.) / В. И. Неупокоев // Революционная ситуация в России в 1859–1861 гг. – Москва: Наука, 1974. – С. 5–6.

6. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў (ЛДГА). Ф. 391. Воп. 5. Спр. 289.

7. О разделении на три разряда людей, принадлежащих к сословию бывшей шляхты // Полное собрание законов Российской империи. Собрание второе – Т. VII. – 1832. – СПб., 1833. – № 5746. – С. 836–837.

8. Krawczak, T. W szlacheckim zaścianku / T. Krawczak. – Warszawa-Siedlce: SONOR LTD, 1993.– 436 s.

9. Чапко, В. У. Бібікавы / В. У. Чапко // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 2: Беліцк – Гімн. – Мінск: БелЭн, 1994. – 537 с.